# “У Беларусі самы бязьлітасны эксплюататар працоўных — гэта дзяржава”

пачатак на ст. 3

працоўных, такога бяспраўя нельга сабе ўявіць у іншых краінах. Нават у параўнаньні з Расеяй гэта неба і зямля.

*— Многія сьцьвярджаюць, што беларускіх чыноўнікаў адзінае, што можа стрымаць — гэта пагроза крытыкі і санкцыяў з боку Міжнароднай арганізацыі працы (МАП). Але яны імкнуцца так пісаць законы, каб тыя фармальна не падпадалі пад парушэньне нормаў МАП. Як вы лічыце, ці трапіць гэтая вэрсія працоўнага Кодэксу пад крытыку міжнародных структураў?*

— Беларуская ўлада дастаткова авантурная — гэта агульнавядома. Але цяпер гэты авантурызм грунтуецца і на тым, што «паперла». «Паперла» ў геапалітыцы — і Эўразьвяз, і ЗША шмат на якія рэчы закрываюць вочы.

Гэта абсалютна не азначае, што МАП менш прынцыпова ставіцца да экспэрымэнтаў беларускай улады ў заканадаўстве. Што тычыцца сыстэмы кароткатэрміновых кантрактаў, то самі па сабе яны — цывілізаваная форма найму. Яны распаўсюджаныя ва ўсім сьвеце. Экспэртам МАП цяжка ўсьвядоміць, што менавіта празьмернае распаўсюджваньне гэтых кантрактаў цягне за сабой парушэньне правоў працоўных.

Мы зь імі працуем, і з часам зьяўляецца разуменьне, што з гэтым прэцэдэнтам трэба вельмі сур’ёзна разьбірацца. Бо Беларусь ператвараюць у краіну часовай занятасьці. Але справа ў тым, што ўсё кепскае вельмі заразнае. Ніхто не гарантуе, што ўсьлед за Беларусьсю ня знойдуцца спрытнюгі, якія захочуць пераняць гэты досьвед. І на сур’ёзнасьць такіх наступстваў мы будзем зьвяртаць увагу, каб жорстка спыніць практыкі прымусовай працы.

**svaboda.org**

# КАНТРАКТНАЙ СЫСТЭМЕ 20 ГАДОЎ

## Што яна дала і ці памяняюць яе?

**ДЭПУТАТ: КАНТРАКТНАЯ СЫСТЭМА «МАЕ СВАЕ ПЛЮСЫ»**

Свой погляд на кантрактную сыстэму і нядаўнія зьмены ў Працоўны кодэкс **«Свабодзе»** расказаў **Віталь Шылаў**, дэпутат Палаты прадстаўнікоў і намесьнік старшыні пастаяннай камісіі працы і сацыяльных пытаньняў.



«Я заўсёды кажу, што крытыкаваць кантрактную форму найму можна было б, калі б яна выкарыстоўвалася толькі на прадпрыемствах і ў арганізацыях дзяржаўнай формы ўласнасьці, — разважае Віталь Шылаў. — Але гэтая форма актыўна выкарыстоўваецца і прыватным бізнэсам. Значыць, яна мае свае плюсы».

Дэпутат таксама расказаў пра зьмены ў Працоўны кодэкс:

«Прынятым законам плянуецца ўнясеньне каля 260 зьменаў і дапаўненьняў амаль у 170 артыкулаў Працоўнага кодэксу, — працягвае Шылаў. — Гэта сьведчыць пра вялікую праведзеную працу. Распрацоўшчыкі імкнуліся ўлічыць інтарэсы ўсіх бакоў. Асноўны ўпор рабіўся на пашырэньне сацыяльна-працоўных правоў работнікаў, у тым ліку і пры ўжываньні кантрактнай формы найму.

Наймальніка абавязалі падаўжаць кантракты з работнікамі, якія ня маюць парушэньняў, на максымальны тэрмін у межах пяцігадовага тэрміну дзеяньня кантракту, а новы заключаць ужо мінімум на тры гады. На работнікаў, якія працуюць паводле кантракту, будзе распаўсюджвацца абмежаваная матэрыяльная адказнасьць пры адсутнасьці намеру ўчыніць шкоду наймальніку. Выключылі так званую «дыскрымінацыйную» норму, якая дазваляла работнікам пэнсійнага ўзросту мець права на атрыманьне кампэнсацыі за датэрміновае скасаваньне кантракту ў сувязі з парушэньнем наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнай дамовы, у памеры трох сярэднямесячных заробкаў (для гэтай катэгорыі раней было прадугледжана двухтыднёвая дапамога).

Таму зьмены ў Працоўны кодэкс я ацэньваю са станоўчага боку, але не сумняваюся, што праца для далейшага ўдасканаленьня заканадаўства аб працы будзе працягнутая».

**ЭКАНАМІСТ: ГЭТА ФОРМА ТАКОГА ПРЫГОННАГА ПРАВА**

Пра тое, як кантрактная сыстэма паўплывала на эканоміку Беларусі, Свабода спытала эканаміста **Яраслава Раманчука**. Ён разважае: можна паразнаму ацэньваць тэмпы росту беларускай эканомікі ў параўнаньні зь іншымі і дынаміку даходаў людзей. Але дакладна, што няма ніводнага паказьніка, які б сьведчыў пра канкурэнтаздольнасьць беларускага рынку працы, прывабнасьць гэтага рынку для інвэстараў, прадпрымальнікаў ці самазанятых.



«У сыстэме, дзе мо 70% месцаў працы ствараюць дзяржаўныя прадпрыемствы, кантракты — гэта бізун, які выкарыстоўваюць «чырвоныя дырэктары» і розныя начальнікі супраць людзей на прадпрыемствах, — кажа Раманчук. — Гэта стала формай такога прыгоннага права, калі начальнік — галоўны самадур, а таленавітыя людзі і тыя, што крытычна мысьляць, ня могуць нічога пярэчыць, бо гэта пагражае проста звальненьнем».

Раманчук дадае, што і дырэктары прадпрыемстваў праз гэтую сыстэму ня могуць звольніць людзей, якіх няма сэнсу трымаць, бо для іх няма працы, а для тавараў няма рынку збыту.


**САЛІДАРНАСЦЬ**

БЮЛЕТЭНЬ БЕЛАРУСКАГА НЕЗАЛЕЖНАГА ПРАФСАЮЗА гарнякоў, хімікаў, нафтаперапрацоўшчыкаў, энергетыкаў, транспартнікаў, будаўнікоў і іншых работнікаў.

Адказны за выпуск Раман ЕРАШЭНЯ
Адрас: 223710, г Салігорск, вул. Багамолава 13а (5-6)
Газета САЛІДАРНАСЦЬ заснавана ў 1991 годзе Іванам ЮРГЕВІЧАМ

Надрукавана на абсталяванні БНП.
Наклад 299 экз.
Выдаецца на правах унутранай дакументацыі.
Распаўсюджваецца бясплатна
Чытайце нас у інтэрнэце: belnp.org, npg.by


Лістуйце нам на E-mail: bnpsoligorsk@gmail.com; Тэл.: 8 (0174) 24 18 90

МЕРКАВАННЕ АЎТАРА МОЖА НЕ СУПАДАЦЬ З ПАЗІЦЫЯЙ ПРАФСАЮЗА

№15(244) інфармацыйны бюлетэнь 26 ліпеня 2019

САЛІДАРНАСЦЬ

www.belnp.org

Беларускага незалежнага прафсаюза гарнякоў, хімікаў, нафтаперапрацоўшчыкаў, энергетыкаў, транспартнікаў, будаўнікоў і іншых работнікаў

*СОЛИДАРНОСТЬ*

# ЗАЯВЛЕНИЕ СОВЕТА БЕЛОРУССКОГО КОНГРЕССА ДЕМОКРАТИЧЕСКИХ ПРОФСОЮЗОВ (БКДП)

*Совет БКДП глубоко возмущен очередным фактом вопиющего нарушения прав профсоюзов Казахстана, выразившемся в осуждении на 7 лет лишения свободы руководителя отраслевого профсоюза работников топливно-энергетического комплекса «Достойный труд» Ерлана Балтабая. Ничем не оправданный приговор одному из лидеров Конфедерации независимых профсоюзов Казахстана (КНПРК) за недоказанные преступления лишний раз подчеркивает жестокость правящего авторитарного режима этой страны.*

*Казахстанские власти не останавливаются ни перед чем*




*в своих действиях по расправе над оппонентами, в числе которых оказались и наши братья по независимому и рабочему движению. Оставшийся безнаказанным расстрел рабочих Жанаозеня повлек за собой осуждение*

Продолжение на ст. 2

*ТРУДОВОЙ КОДЕКС*

# ЗАКОН О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ТРУДОВОЙ КОДЕКС ПОДПИСАН ПРЕЗИДЕНТОМ




**На сайте президент Беларуси появилась новость, что Александр Лукашенко подписал Закон «Об изменении законов», которым вносятся изменения в действующий Трудовой кодекс Республики Беларусь, несмотря на призыв независимых профсоюзов не ухудшать правовое положение граждан.**

Как сообщается на сайте президента, принятие Закона направлено на создание условий для эффективной и гибкой занятости граждан и расширение социально-трудовых гарантий работников.

Документом предусмотрено регулирование порядка временного перевода с согласия работника на другую работу, в том числе к другому нанимателю. Размер выходного пособия увеличен до одной среднемесячной заработной платы, если увольнение работника произошло по причине установления неполного рабочего времени (менее половины нормы). Установлен месячный срок предупреждения работника об изменении существенных условий труда. Предоставлена возможность работать по совместительству полный рабочий день или смену в период трудового отпуска.

Новацией Закона является включение в Трудовой кодекс новой главы, которая регулирует отношения работника и нанимателя при выполнении дистанционной работы.

С целью обеспечения трудовых прав работников закон предусматривает, что по соглашению сторон 5-летний контракт с работником, не допускающим нарушений дисциплины, будет продлеваться до истечения максимального срока его действия. А новый контракт с таким работником будет заключаться на срок не менее трех лет. На меньшие сроки контракты будут продлеваться и заключаться новые только с письменного согласия работника.

Продолжение на ст. 2

# ЗАКОН О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ТРУДОВОЙ КОДЕКС ПОДПИСАН ПРЕЗИДЕНТОМ

начало на ст. 1

В Трудовом кодексе закреплены нормы, предусматривающие, что материальная ответственность будет наступать одинаково и для тех, кто работает по контракту, и для тех, кто по трудовому договору, только за умышленное причинение имущественного вреда.

Председатель Белорусского Независимого профсоюза **Максим Позняков** прокомментировал вошедшие в ТК изменения:

*- Чуда не случилось, президент подписал закон об изменении Трудового кодекса. Таким образом, Беларусь стала страной временной занятости. Система всеобщих краткосрочных трудовых контрактов, которая теперь закреплена в Трудовом кодексе, не даёт людям гарантий на постоянную, стабильную работу, побуждая, в первую очередь молодых работников, мигрировать в поисках лучшей жизни. С другой стороны, человек может стать заложником 5 летнего контракта и будет вынужден отработать его до конца, если наниматель будет против расторжения трудового договора по соглашению сторон, не взирая на желание работника уволиться! Так о какой гибкой и эффективной занятости здесь идёт речь?*



По мнению демократических профсоюзов, принятый Палатой представителей Национального собрания 26 июня во втором чтении законопроект, предусматривающий внесение изменений в Трудовой кодекс, повлек беспрецедентное снижение трудовых гарантий работников и превратил ТК страны в один из худших в мире. Сказано в Заявлении Ассоциации профсоюзов «Белорусский конгресс демократических профсоюзов», от 18 июля.

Законопроект закрепил в Трудовом кодексе право нанимателей заключать краткосрочные контракты со всеми категориями работников без их согласия. Таким образом, Беларусь окончательно превратилась в единственную в мире страну временной занятости, где контрактная форма найма из исключения стала правилом. Следствием имплементации в ТК норм Декрета №29 «О дополнительных мерах по совершенствованию трудовых отношений, укреплению трудовой и исполнительской дисциплины», которым была введена практика перевода работников на срочные трудовые контракты, законодательно закреплена невозможность их увольнения по собственной инициативе, что является, по сути, элементом принудительного труда.

Повсеместное применение норм Декрета №29 повлекло трансформацию договорных трудовых отношений, основанных на волеизъявлении сторон, в законодательный инструмент принуждения, что противоречит нормам Конвенции №29 МОТ о запрете принудительного труда.

Закрепление в ТК норм Декрета №5 «О повышении ответственности руководящих кадров и работников организаций», расширило основания увольнений работников по инициативе нанимателя и узаконило чрезмерные дисциплинарные наказания работников.

Члены Совет БКДП, в котором объединены представители четырех профсоюзов, считают, что принятый законопроект прямо противоречит решению проблем и вызовов, стоящих перед страной. Вместо создания условий для реализации инициативы работников, остро необходимых в период трансформации экономики, в ТК вносятся изменения, превращающие трудящихся в закрепощенных и безынициативных исполнителей. Всё это ещё больше усугубит положение, в котором находится экономика страны, и, по сути, исключает возможность использования для её преобразований человеческого фактора, потенциала работников.

Напомним, что данное заявление было адресовано президенту Беларуси в котором члены Совета БКДП призывали не подписывать принятый закон.

Подписанный Закон вступит в силу через шесть месяцев после его официального опубликования.

# ЛИДЕРУ НЕЗАВИСИМОГО ПРОФСОЮЗА ВЫНЕСЛИ ПРИГОВОР

начало на ст. 1

*председателя КНПРК Ларисы Харьковой, ее коллег Амина Елеусинова и Нурбека Кушакбаева. Очередной жертвой режима стал Ерлан Балтабай. Мы требуем от властей Казахстана немедленного прекращения своей преступной политики в отношении лидеров и членов рабочего и независимого движения, преследования и расправ над ними.*

*Совет БКДП выражает свою поддержку Ерлану Балтабаю, всем нашим братьям и сестрам по независимому профсоюзному движению Казахстана. От имени своих членов заявляем о готовности оказывать любую солидарную помощь и поддержку в их борьбе за права и свободы трудящихся страны. Призываем членские организации, входящие в Международную конфедерацию профсоюзов, международное профсоюзное движение в целом присоединиться к кампании за прекращение судебных расправ и репрессий над нашими казахстанскими братьями и сёстрами, немедленное освобождение Ерлана Балтабая, отмены приговора и оправдания Ларисы Харьковой.*

**Вместе мы победим!**
**18 июля 2019 года, г. Минск**

17 июля Енбекшинский районный суд города Шымкента приговорил Ерлана Балтабая к 7 годам тюремного заключения. Сам он настаивает, что дело имеет политическую подоплеку. Схожее мнение высказывают казахстанские правозащитники.

На вопрос судьи, понятен ли ему приговор, Балтабай заявил:

— Ложь! У прокуратуры и следователя нет ни одного доказательства. Это не государственные деньги, а профсоюзные. Ни у прокуратуры, ни у следствия нет права требовать эти деньги. Вы говорите «приговор», да плевать я хотел на ваш приговор! — сказал Балтабай, встав с места.

# “У БЕЛАРУСІ САМЫ БЯЗЬЛІТАСНЫ ЭКСПЛЮАТАТАР ПРАЦОЎНЫХ — ГЭТА ДЗЯРЖАВА”

**Старшыня Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандар Ярашук ацэньвае станоўчыя і нэгатыўныя бакі новага Працоўнага кодэксу, адказвае на пытаньне “Свабоды”, ці будуць прадпрыемствы «гандляваць» працаўнікамі як прыгоннымі сялянамі, і тлумачыць, на чым грунтуецца авантурызм беларускай улады — бо ёй «паперла».**

### СЬЦІСЛА

- **Сыстэма кароткатэрміновых кантрактаў фармуе ў працоўных страх, безыніцыятыўнасьць і пакорлівасьць.**
- **Такога бяспраўя працоўных, як у Беларусі, нельга сабе ўявіць у іншых краінах.**
- **Сыстэма кароткатэрміновых кантрактаў сфармавала «прыгонных», а цяпер імі ўжо можна і «гандляваць» на паўгода, перадаючы іншаму наймальніку.**
- **Беларусь пераўтвараюць у краіну часовай занятасьці. Але ўсё кепскае вельмі заразнае.**

У новым Кодэксе канчаткова ўзаконеная сыстэма кароткатэрміновых кантрактаў

*— Аляксандар Лукашэнка падпісаў новую вэрсію Працоўнага кодэксу — папраўкі, якія былі прынятыя Палатай прадстаўнікоў. Які галоўны сэнс гэтых зьменаў? Ці былі яны накіраваныя на павялічэньне правоў працоўных, ці, хутчэй, варта казаць пра адваротны працэс?*

— Працоўны кодэкс, як і любы закон, павінен разьвівацца, ён не статычны. Туды трэба ўносіць зьмены, бо сытуацыя на рынку працы імкліва зьмяняецца. Тое, што там зьявіліся навэлы, якія сталі адказам на патрабаваньне часу — гэта станоўча, бо апошні раз Кодэкс мяняўся недзе ў сярэдзіне нулявых.

Тое, што зьявілася паняцьце дыстанцыйнай працы, тое, што тата цяпер можа ісьці ў адпачынак (за свой кошт, дарэчы) па доглядзе за дзіцем — гэта станоўча, і нават апанэнт рэжыму не павінен гэтага адмаўляць.

Але ёсьць адваротны бок мэдаля, які, з нашага пункту гледжаньня, перакрэсьлівае ўсё станоўчае, што там было зроблена. Дарэчы, адпачатку працэс ішоў такім чынам, што асобна выпрацоўваліся зьмены ў Працоўны кодэкс, і асобна ішоў працэс, каб у Кодэкс перанесьці нормы дэкрэтаў прэзыдэнта аб часовых кантрактах і звальненьні працоўных. І на тым этапе большасьць экспэртаў, нават дзяржаўных, нэгатыўна выказвалася пра гэтыя спробы. Але ў далейшым два гэтыя праекты аб’ядналі.

*— Відавочна, нягледзячы на думку экспэртаў, пайшла палітычная замова на тое, каб узмацніць менавіта беларускую сыстэму кароткатэрміновых кантрактаў.*

— Вы абсалютна маеце рацыю. Тут была спроба прапаганды высунуць наперад тыя станоўчыя моманты, якія былі ўнесеныя. Але тое, што ў новым кодэксе канчаткова ўзаконеная сыстэма кароткатэрміновых кантрактаў — гэта самае нэгатыўнае, што магло адбыцца ў сфэры працоўных адносінаў.

Нідзе, ні ў якіх краінах ніхто ня робіць кароткатэрміновыя кантракты правілам, заўсёды гэта было выключэньнем. Толькі ў Беларусі гэта зрабілі правілам, і гэта будзе мець самыя нэгатыўныя наступствы — і для працаўнікоў, і для дзяржавы.

Для працаўнікоў — бо ўзаконеная прымусовая праца, людзі ня могуць звальняцца, бо знаходзяцца на ланцугу кароткатэрміновых кантрактаў. Для дзяржавы — бо яна ня можа задзейнічаць чалавечы фактар. Бо гэтая сыстэма кароткатэрміновых кантрактаў ніякага дачыненьня да эканомікі ня мае, яна мае дачыненьне да палітыкі. Яна фармуе ў працоўных страх, безыніцыятыўнасьць і пакорлівасьць.

*— Таксама цікавае новаўвядзеньне, што працаўнікоў наймальнікі могуць пераводзіць на іншую працу, да іншых наймальнікаў, на тэрмін да 6 месяцаў. Гэта як памешчыкі гандлявалі сваімі прыгоннымі сялянамі?*

— Беларуская прапаганда і Фэдэрацыя прафсаюзаў увесь час цьвердзіла, што мы адзіная краіна, якая ня мае так званай пазыковай працы. І што гэтая заганная сыстэма гандлю працоўнымі недапушчальная і ёй ня будзе месца ў Беларусі. Але раптам аказалася, што без усялякіх алігархаў гэтая сыстэма ў Беларусі зьмянілася.

Глябалізацыя мяняе рынак працы, і мы не выключэньне. Але калі ўлічыць, што ў Беларусі дзяржава — галоўны і часам адзіны працадаўца, можна ўявіць, якія могуць быць наступствы. Таму, я думаю, гэты жарт пра памешчыкаў — горкі жарт, якія можа стаць рэальнасьцю. Мы і так увесь час кажам, што сыстэма кароткатэрміновых кантрактаў сфармавала «прыгонных», а цяпер імі ўжо можна і «гандляваць» на паўгода, перадаючы іншаму наймальніку.

Такога бяспраўя працоўных, як у Беларусі, нельга сабе ўявіць у іншых краінах

*— Традыцыйна прафсаюзы цягам сваёй гісторыі змагаюцца з «капіталам», які можа дзеля прыбытку парушаць правы працоўных. Але так атрымліваецца, што ў Беларусі больш за іншых парушае правы працоўных дзяржава?*

— Я думаю, што каб у гэтым пераканацца, дастаткова вярнуцца ў савецкія часы. Гэты быў узор эксплюатацыі. І цяпер няма больш бязьлітаснага эксплюататара за дзяржаву. Бо дзяржава — гэта не безасабовы монстар. Чыноўнікі на ўсіх узроўнях, у тым ліку на прадпрыемствах, распараджаюцца лёсам працоўных ад імя дзяржавы. Але пры гэтым ніякай асабістай адказнасьці за лёс гэтага прадпрыемства не нясуць.

У той час, калі працадаўца усім рызыкуе, ён зацікаўлены непасрэдна, каб усё было ў парадку і з працаўнікамі. І паколькі ў Беларусі так і не зьявіўся ўласьнік, паколькі галоўны ўласьнік — дзяржава, то мы павінны разважаць пра звышэксплюатацыю з боку дзяржавы, якая акурат і праявілася ў зьменах у Працоўны кодэкс.

Беларускі Працоўны кодэкс — гэта мара любога нэалібэрала. Бо такіх жорсткіх умоваў для

Працяг на ст. 4